# * § 2–3–0. Эвалюцыя грамадства і эканомікі ў старажытнасці

**1. Перыядызацыя найстаражытнейшай гісторыі чалавецтва.** Дакладныя храналагічныя межы найстаражытнейшай гісторыі чалавецтва вызначыць немагчыма. Для розных рэгіёнаў, нават на еўрапейскім кантыненце, яны адрозніваліся; некаторыя з прадстаўленых перыядаў і ўвогуле адсутнічалі. Так, энеаліт быў характэрны не для ўсёй Еўропы, а галоўным чынам для поўдня кантынента. Розны час і розную працягласць маюць перыяды неаліту і бронзавага веку, вызначаныя спецыялістамі для Цэнтральнай, Паўднёва-Усходняй, Паўночнай Еўропы і да т. п.

**Перыядызацыя драўнейшай гісторыі чалавецтва**

| Палеаліт (старажытны каменны век) | | | Мезаліт (сярэдні каменны век) | Неаліт (новы каменны век) |
|---|---|---|---|---|
| **ранні (ніжні) палеаліт** | **сярэдні палеаліт** | **позні (верхні) палеаліт** | | |
| 2,6 млн гадоў таму — 200 тыс. гадоў таму | 200 — 40–35 тыс. гадоў таму | 40–35 — 10 тыс. гадоў таму | 10 — 8/7 тыс. да н. э. | 8/7 — 5/4 тыс. да н. э. |

| Энеаліт (медна-каменны век) | Бронзавы век | Жалезны век |
|---|---|---|
| 5/4–3 тыс. да н. э. | 3 тыс. — VIII ст. да н. э. | VIII ст. да н. э. — 476 г. |

1. Які перыяд «з'явіўся» ў перыядызацыі старажытнай гісторыі чалавецтва? Як вы лічыце, чым было абумоўлена вылучэнне такога перыяду ў гісторыі асобных краін Еўропы?
2. Параўнайце перыядызацыю старажытнай гісторыі чалавецтва з перыядызацыяй першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Зрабіце вывады.
3. Існуе думка, што ў гісторыі беларускіх земель непраўамерна вылучаць перыяд бронзавага веку. Знайдзіце ў дадатковых крыніцах інфармацыю, якая абгрунтоўвае гэтае меркаванне.

## 2. Беларускія землі ў эпоху неаліту.

**2.1.** У перыяд неаліту на тэрыторыі Беларусі (5–3-е тыс. да н. э.) з’яўляюцца і паступова пашыраюцца земляробства і жывёлагадоўля. Разам з пранікненнем на нашы землі новага насельніцтва, якое гаварыла на індаеўрапейскіх мовах, гэта стала найбольш значнай падзеяй першабытнай эпохі.

Пра з’яўленне вытворчай гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі, а менавіта земляробства, сведчыць знойдзены археолагамі пылок акультураных злакаў — пшаніцы і ячменю, а таксама пустазелля. Гэтая самая старажытная прыкмета знойдзена на тэрыторыі паўднёва-заходняга Беларускага Палесся, яе ўзрост — 7 тысяч гадоў. Праз некалькі стагоддзяў найбуйнейшае вынаходства чалавецтва дасягнула цэнтральных раёнаў Беларусі. Так, пылок пшаніцы знойдзены каля стаянкі Заценне ў Лагойскім раёне Мінскай вобласці. Напрыканцы неаліту сляды земляробства з’яўляюцца і на поўначы Беларусі.

Выяўлена таксама, што неалітычнае насельніцтва займалася гадоўляй розных свойскіх жывёл: коз, авечак, буйной рагатай жывёлы, свіней і коней.

Сведчаннем большага пашырэння земляробства ў познім неаліце з’яўляюцца таксама знаходкі пэўных прылад працы. Сярод іх — сякеры, сярпы і серпападобныя нажы, матыкі і зерняцёркі.

Змены на беларускіх землях у эпоху неаліту адбыліся не адразу. Доўгі час аснову жыцця насельніцтва па-ранейшаму складалі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Толькі з сярэдзіны 4-га тыс. да н. э. з’яўляюцца новыя тыпы каменных прылад з двухбаковай апрацоўкай. Гэта былі разнастайныя наканечнікі стрэл, сякеры, цёслы, долаты. Адзначаецца відавочнае павелічэнне ліку сякучых прылад.

1. Чым, на вашу думку, былі абумоўлены геаграфія і дынаміка пашырэння земляробства на тэрыторыі Беларусі?
2. Як вы лічыце, з чым было звязана павелічэнне ў неаліце ліку сякучых прылад працы?

**2.2.** Адметнай рысай неаліту было паўсюднае пашырэнне глінянага посуду — керамікі. З цягам часу яна робіцца больш дасканалая: сценкі гліняных гаршкоў прыкметна танчэюць. Керамічныя вырабы пакрываюцца разнастайнымі арнаментамі.

Менавіта дзякуючы арнаменту на гаршках сучасныя вучоныя змаглі вызначыць час з'яўлення новага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі.

Прыблізна ў сярэдзіне 3-га тыс. да н. э. на поўначы Беларусі з'яўляецца кераміка з ямачна-грабеньчатым адбіткам. Такую самую кераміку мела і фіна-ўгорскае насельніцтва Волга-Окскага міжрэчча. Такім чынам вучоныя высветлілі, што ў глыбокай старажытнасці адбылася міграцыя фіна-ўграў з усходу.

У XXVI ст. да н. э. на паўднёвым захадзе — у паўднёвым Панямонні і на Верхняй Прыпяці — з'явілася насельніцтва, якое вырабляла лейкападобныя кубкі.

Напрыканцы 3-га тыс. да н. э. заходнія і паўднёвыя беларускія землі зазналі яшчэ адну міграцыю. З захаду прыйшло насельніцтва, якое вельмі клапатліва ставілася да сваіх памерлых. У магілы яны клалі асаблівыя керамічныя вырабы — шарападобныя амфары, крамянёвыя сякеры, упрыгажэнні. Сустракаліся і рытуальныя пахаванні свойскіх жывёл. У побыце гэтае насельніцтва выкарыстоўвала разнастайныя гаршкі шарападобнай формы.

Яшчэ ў канцы 4-га — 3-м тыс. да н. э. насельніцтва з такой самай матэрыяльнай культурай заняло велізарныя прасторы ад Эльбы на захадзе да вярхоўяў Дняпра на ўсходзе, балтыйскага ўзбярэжжа на поўначы і Дуная на поўдні.

На мяжы 3–2-га тыс. да н. э. на нашы землі пранікаюць плямёны, на кераміку якіх нязменна наносіўся адбітак шнура. Апроч таго, яны пакінулі па сабе тысячы прасвідраваных каменных сякер. Усё гэта было старажытнае індаеўрапейскае насельніцтва Еўропы. Да 2-га тыс. да н. э. ужо амаль ва ўсёй Еўропе яе жыхары гаварылі на індаеўрапейскіх мовах.

Так пачалася новая старонка ў гісторыі Беларусі. Прышлыя групы людзей не здолелі знішчыць ранейшае насельніцтва, у выніку адбылося іх аб'яднанне і фарміраванне новай культуры, новага ладу жыцця, у якім вядучую ролю адыгрывалі земляробства і жывёлагадоўля.

1. Як вы лічыце, як было звязана з'яўленне керамікі з развіццём вытворчай гаспадаркі?
2. Якія элементы старажытнай керамікі з'яўляюцца важнай крыніцай інфармацыі для вучоных-гісторыкаў?

**3. Бронзавы і жалезны вякі на тэрыторыі Беларусі.** Са з'яўленнем на беларускіх землях бронзавых вырабаў

і металургіі пачынаецца новы перыяд — бронзавы век (3-е тыс. да н. э. — VIII ст. да н. э.).

Насельніцтва яшчэ некаторы час захоўвала лад жыцця перыяду неаліту, па-ранейшаму пераважалі каменныя (крамянёвыя) прылады працы. Яны былі патрэбныя ў сувязі з пашырэннем земляробства: беларускія землі былі пакрытыя глухімі лясамі, вялікай працы ўсяго радавога калектыву патрабавала іх высечка.

Індаеўрапейцы, пранікнуўшы на беларускія землі, змаглі вырашыць праблему забеспячэння сыравінай для стварэння так неабходных у лясным краі сякер. У сярэднім цячэнні ракі Рось у цяперашнім Ваўкавыскім раёне ў тоўшчы мелу было знойдзена буйное радовішча натуральнага крэменю. Каля цяперашняга пасёлка Краснасельскі перасяленцы, што карысталіся шарападобнымі амфарамі, стварылі тысячы шахтаў. Тут жа была наладжана работа майстэрань, асноўнай іх прадукцыяй былі сякеры. Варта адзначыць вельмі высокі ўзровень працы і шахцёраў, і майстроў. Каля тысячы гадоў ішла здабыча крэменю ў краснасельскіх шахтах, пакуль патрэба ў гэтай сыравіне не знікла.

Толькі з надыходам жалезнага веку насельніцтва беларускіх зямель адмовілася ад выкарыстання каменных сякер.

Дзве найважнейшыя падзеі, што пачаліся ў папярэднім перыядзе, знайшлі працяг у бронзавым веку. Менавіта ў гэтыя часы беларускія землі набылі новае этнічнае аблічча, галоўным чынам у выніку шырокага рассялення індаеўрапейцаў. На беларускіх землях паступова на першае месца выходзяць вырабляючыя формы гаспадаркі.

Першыя металічныя вырабы на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца ў Верхнім Падняпроўі. Сярод найбольш ранніх знойдзеных археолагамі рэчаў — плоская бронзавая сякера і меднае шыла. З'яўленне менавіта тут першых рэчаў з металаў звязанае з недахопам крамянёвай сыравіны. Часткова гэтая праблема вырашалася за кошт вырабу прылад працы з дрэва і косці.

Але ў асноўным да эпохі металаў даводзілася вымяньваць якасны крэмень у суседзяў.

Пашырэнне металургіі жалеза стварыла зусім іншыя ўмовы для развіцця насельніцтва Беларусі. У набыцці навыкаў вырабу і апрацоўкі жалеза зноў перамагаў поўдзень Беларусі. Але досыць хутка — у другой палове 1-га тыс. да н. э. — сакрэты атрымання жалеза і кавальскай справы сталі вядомыя ў цэнтральнай і паўночнай частках Беларусі. Выкарыстанне жалезных прылад працы мела асаблівае значэнне менавіта для лясных прастораў нашага краю. Жалезная сякера дазваляла расчысціць большую плошчу для земляробства і выпасу жывёлы.

Значна павялічылі прадукцыйнасць працы саха з жалезным нарогам, рала з наральнікам, сярпы і косы. У выніку прадукты выраблялiся ў большым аб'ёме, а гэта карэнным чынам паўплывала на развіццё грамадства.

Дзякуючы развіццю абмену, умацаванню сувязей з суседнімі і аддаленымі абласцямі беларускія землі аказаліся шчыльна знітаваныя з агульнаеўрапейскімі працэсамі і не адставалі ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця ад іншых рэгіёнаў Усходняй, Цэнтральнай і Паўночнай Еўропы. Назіраецца пэўная сінхроннасць у іх развіцці ў перыяд жалезнага веку.

Якія фактары, на вашу думку, абумовілі працяглае выкарыстанне насельніцтвам беларускіх зямель каменных прылад працы?

### 4. Дасягненні першабытнай эпохі.

1. Запоўніце табліцу «Асноўныя дасягненні і адкрыцці чалавецтва ў эпоху першабытнасці».
2. Якое адкрыццё, дасягненне старажытнага чалавека, на вашу думку, было самае значнае? Сваё меркаванне аргументуйце.

**Асноўныя дасягненні і адкрыцці чалавека ў эпоху першабытнасці**

| Перыяд | Адкрыцці, дасягненні | Гістарычнае значэнне |
|---|---|---|
| Палеаліт | | |
| Мезаліт | | |
| Неаліт | | |
| Бронзавы век | | |
| Жалезны век | | |

3. Складзіце тэзісны план адказу на пытанне «Асноўныя працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця першабытнага грамадства і іх асаблівасці на тэрыторыі Беларусі».
4. Выкарыстоўваючы памятку ў вучэбным дапаможніку «Як даваць азначэнне паняццю», сфармулюйце азначэнне паняцця «першабытнае грамадства».